



# МОЦ КАРАНЁЎ, БЕЗДАНЬ НЯБЁСАЎ

## Як маладая беларуская даследчыца расшыфравала наш культурны код праз шолах лістоты

***Наша даведка***

*Яна Шаўчэнка – навуковы супрацоўнік аддзела нарадазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры (з 2017 г.). Нарадзілася 1 жніўня 1991 г. у г. Наваполацку. Скончыла гісторыка-філалагічны факультэт Полацкага дзяржаўнага універсітэта (2013 г.) па спецыяльнасці «гісторык, выкладчык гісторыі і сацыягуманітарных дысцыплін»; магістратуру Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «айчынная і ўсеагульная гісторыя» (2014 г.); аспірантуру пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры (2017 г.). Са студэнцкіх гадоў актыўна ўдзельнічае ў палявых этнаграфічных даследаваннях як у складзе навуковых экспедыцый, у тым ліку інтэрнацыянальных (Беларусь – Эстонія), так і самастойна. Аўтарка навукова-папулярнай кнігі «Дзікарослы раслінны свет у традыцыйных уяўленнях і сучасным жыцці беларусаў». Лаўрэат прэміі для маладых навукоўцаў імя акадэміка У.М. Ігнатоўскага НАН Беларусі (2022 г.).*

«І насадзіў Бог лес. І насяліў яго птушкамі і звярамі. І толькі потым стварыў чалавека…». Прыкладна так пачынаюцца некаторыя старадаўнія беларускія паданні, што праз стагоддзі захавалі ў сабе ключ да нашага калектыўнага падсвядомага.

Сёння, калі над Беларуссю часта пануе спёка і веюць небывалыя сухавеі, многія з нас хвалююцца за флору роднай краіны: за лясы, доступ у якія абмежаваны з-за небяспекі пажараў, палі, дзе трэці месяц не можа напіцца жыта, ды і за іх насельнікаў – звяроў і птушак… Розум кажа: гэта перажыванні за ўраджай, будучыя цэны на прадукты, біяразнастайнасць, магчымасць збіраць суніцы і баравікі. Але душа пытаецца, адкуль ва ўсім гэтым няўлоўная нотка цеплыні. Можа, унутры нас гаворыць голас продкаў, нават калі розум лічыць гэта містычнай выдумкай?



Для шмат якіх пакаленняў людзей тысячы гадоў таму свет пачынаўся з зялёнага акіяну лясоў, які ўвасабляў жыццё ва ўсіх яго праявах: даваў не толькі ежу, вопратку, лекі і дах над галавой, але і абарону ад ворагаў, душэўны спакой, натхненне для вынаходніцтваў і іншых творчых пошукаў.

Ці шмат змянілася? Вобразы раслін дагэтуль з намі на карцінах, сукенках, гербах, нават на айфоне і кампутары, з якіх можна хоць з лесу пісаць любы тэкст. А, галоўнае, паміж намі і раслінамі – усё тая ж «хімія» ва ўсіх сэнсах. Пачынаючы ад літаральнага: дзякуючы абменным працэсам у арганізмах прадстаўнікоў флоры мы можам фізічна існаваць, дыхаючы паветрам з неабходным працэнтам кіслароду. Пра парадаксальную і жыватворную повязь усяго непадобнага – чалавека з дрэвам, біялогіі з культурай, этналогіі з маркетынгам і шмат чым яшчэ – мы пагутарым сёння з навукоўцам, што імкнецца абагуліць тысячагадовыя веды аб раслінах.

## Адзін корань і тры сцяблінкі

Усё пачалося з цікавасці да мінуўшчыны. Яна Шаўчэнка ўпэўнена: сам факт з’яўлення на свет у гістарычна значнай мясцовасці гэтаму спрыяў: «*Уявіце: Навапалацк – адзін з самых маладых беларускіх гарадоў, але побач – самы старэйшы з іх, Полацк. Розніца паміж гадамі іх заснавання – 1958 і 862 – проста каласальная!*». Ад асэнсавання гэтай бездані часу літаральна дух захоплівала.

Бацькі, людзі творчыя і адукаваныя, падзялялі захапленне дзяўчынкі. Тата, мастак у музеі гісторыі і культуры, і мама, дырэктар універсітэцкай навуковай бібліятэкі, любілі вандроўкі па родным краі. «*У мяне натуральным чынам сфармавалася разуменне, што мы маем вялікі пласт гісторыі, якая павінна быць прэзэнтавана, бо мы не горшыя за іншых – мы ўнікальныя*»,– успамінае суразмоўца сваё станаўленне, дадаючы, што гэта «*заахвоціла заняцца гісторыяй прафесійна*».

Калі ў старэйшых класах школы прыйшоў час выбіраць спецыялізацыю, ваганняў не было. Паступленне ў 2008 г. у Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт на спецыяльнасць «сусветная і айчынная гісторыя» стала лагічным працягам. Вучылася з вялікім задавальненнем і цікавасцю.

– *Пяць гадоў – гэта былі незабыўныя прыгоды. Экспедыцыйныя,* – прыгадвае Яна.– *Жыццё ў намётах, сустрэчы з вялікай колькасцю інфармантаў… У той перыяд я атрымала свой першы вопыт палявых даследаванняў у якасці этнолага. І, канечне, мяне гэта захапіла. Гэта аказалася менавіта тое, чым я хацела б займацца. Той пласт спадчыны, які адкрыўся для мяне і для маіх калег-навукоўцаў,* – *проста неабсяжны! І настолькі прыцягальны, што прайсці міма і памяняць накірунак дзейнасці ўжо не ўяўлялася магчымым.*

Паступова два адгалінаванні навуковых ведаў зліліся ў лёсе Яны ў адну плынь, фармуючы з будучага гісторыка яшчэ і этнографа. Адкуль жа ўзялася тэма раслін, калі дзяўчына быццам бы не марыла быць этнабатанікам?

А ўзялася яна з унутранага пачуцця. Паэт бы сказаў: з сэрца.

– *Люблю прыроду,* – прызнаецца раптам мая суразмоўца і тут жа шукае рацыянальнае тлумачэнне, – *магчыма, гэта звязана з дзяцінствам. Я часта магла з бацькам наведваць лес, хадзіць па грыбы, ды і проста паблукаць.*

І напаўжарт: «*Прагулкі сярод дрэў – добры такі антыстрэсавы сродак*».

Падчас навучання ў Полацкім універсітэце, у 2009 г., у першай сваёй навуковай экспедыцыі (у Докшыцкі раён, удакладняе Яна) адчуванне дзівоснасці і магіі роднай прыроды канчаткова расквітнела. І выклікала жаданне яго растлумачыць навуковымі сродкамі:

*– Калі ты ідзеш да вёскі, крочыш па лясах, па гэтых бязмежных палях – ну немагчыма проста не захапіцца хараством прыроды! Гэта настолькі зацягвае. Калі я выбірала тэму курсавой працы на першым курсе, думала: пра што ж я буду пісаць? І раптам у галаву прыйшла думка: я хачу пісаць пра лес, пра лясную прастору.*

Цікава, што ўслед за лясамі ўзнікла цікавасць да прасторы сакральнай – даследавання святых камянёў і крыніц. Яшчэ праз год Яна вырашыла пісаць работу пра дзікіх жывёл. Дыпломная праца аб’ядноўвала ўсе гэтыя кампаненты ў гістарычным развіцці народнай культуры. Але, працягнуўшы вучобу пасля ВНУ ў аспірантуры Акадэміі навук, маладая даследчыца зразумела, што трэба абіраць больш дакладны напрамак працы.

*– Жывёлы – гэта, канечне, даволі спецыфічны момант,–* дзеліцца крытэрыямі выбару Яна.*– Іх знайсці складаней, чым расліны, тым больш у дзікай прыродзе (а я вывучала менавіта віды, не акультураныя чалавекам). Паколькі мне было цікава менавіта ў натуральнай сферы, то і вырашыла займацца дзікарослымі раслінамі.*

Выявілася, што ў айчыннай этналагічнай навуцы асобныя, не абагульняючыя працы на тэму раслін былі і раней. У прыклад Яна прыводзіць даследаванні фалькларыста Вольгі Мікалаеўны Шарай, этнолагаў Леаніда Осіпавіча Мінько, Таццяны Іванаўны Кухаронак, Канстанціна Анатольевіча Шумскага і, канечне, сваёй навуковай кіраўніцы Любові Васільеўны Ракавай, якая вывучала традыцыі агародніцтва. Але папярэднікі даследавалі асобныя аспекты ўзаемадзення з прыродай.

*– А мне былі цікавыя менавіта расліны, якія знаходзяцца на незасвоенай чалавекам прасторы,–* кажа Яна.*– Тое, што ён супрацьпастаўляе свайму атачэнню. Вось ёсць хата, агарод – гэта яго жыццёвая прастора, а ёсць, умоўна кажучы, чужое: поле, балота, лес – «тэра інкогніта», нязведанае.*



Працягнуўшы паглыбляцца ў дзікарослы раслінны свет, навукоўца хутка зразумела: *«Сфераў яго выкарыстання – проста процьма: гэта літаральна ўсё, што мы бачым».*

*– Я паспрабавала аб’яднаць у адно розныя кірункі, якія да гэтага вывучаліся паасобку. Таму праца сама па сабе атрымалася як бы міждысцыплінарная. Тут спалучыліся і чыста этналагічны аспект, і этнабатаніка, фалькларыстыка, калі вывучаецца вусная народная творчасць, акрамя таго, і лакальныя назвы, мовазнаўства – час ад часу… Гэта вялікі спектр навук. І канечне, гістарычныя метады выкарыстоўваюцца, само сабой зразумела. Я паспрабавала гэта ўсё аб’яднаць.*

## Духоўны бок зямных раслін

Самы грунтоўны кампанент свету флоры супадае з найвялікшым ярусам лесу – гэта дрэвы. Са старадаўніх часоў у розных народаў (беларусы не выключэнне) яны былі аб’ектам культу.

*– Гэта таму, што, па ўяўленнях людзей, дрэвы, дзякуючы вышыні – найбольш набліжаныя да Бога, да боскай сферы,–* тлумачыць Яна Сяргееўна.*– Лічылася: чым вышэйшае дрэва, тым бліжэй яно да неба. Гэта месца, дзе пражываюць птушкі – божыя істоты. І вось паглядзіце, як цікава. Калі вы ведаеце, у розных народаў свету ёсць матыў пра Сусветнае дрэва як цэнтр Сусвету. Напрыклад, у скандынаўскай міфалогіі – дрэва Ігдрасіль, якое каранямі ўзыходзіць да іншасвету, цэнтральная частка якога – сфера людзей, а вяршыня і крона – боскі свет: птушак, багоў і ўсяго, што*

*звышнатуральнае. Уяўленне пра Сусветнае дрэва – элемент фальклору шмат якіх народаў.*

У гэтым рэчышчы выглядае цалкам арганічна, што і ў беларусаў старажытных часоў дуб, самае магутнае дрэва нашых шырот, успрымаўся як увасабленне бога Перуна. У народным мастацтве надоўга захаваўся такі архетып як аб’ект пакланення, і вельмі часта было распаўсюджана ўяўленне аб дубе – «цары дрэваў»… Слухаючы Яну, хочацца дадаць, што і ў сучаснага чалавека пры сустрэчы з гэтым зялёным волатам нярэдка ўзнікае міжвольнае захапленне – мы можам зразумець пачуцці продкаў і пад панцырам утылітарнай цывілізацыі.

*– Частка апавяданняў, легенд і паданняў у беларусаў пачынаюцца з таго, што Бог вырашыў засеяць лес. І такім чынам потым ужо з’явяліся іншыя лакацыі, але першааснова свету – гэта лес. Дзікарослыя расліны – першае, што чалавек бачыць, калі трапляе ў дзікую прыроду. Дрэвы. Ёсць яшчэ кустоўе, тыя ж самыя ягады, у тым ліку ядомыя, якія мы выкарыстоўваем кожны дзень як ежу.*

Духоўная роля раслін цесна пераплецена з матэрыяльным выкарыстаннем. Эзатэрычны свет беларусаў выбудоўваўся на тым, што аб’екты яго пакланення найперш давалі яму само жыццё як магчымасць фізічна існаваць і выжываць, і так з пакалення ў пакаленне.

*– Тыя агульнавядомыя ягады, якія чалавек выкарыстоўвае ў ежу, назапашвае – гэта адна катэгорыя. Ёсць, канечне, асобныя часткі раслін і кветкі, якія выкарыстоўваліся ў штодзённасці ў якасці фарбавальнікаў або, скажам, розных прытраў. Калі паглыбляцца, гэта процьма, процьма розных сфераў выкарыстання. І ў штодзённым побыце ў якасці ежы, у нацыянальнай, народнай кухні. Дэкаратыўнае выкарыстанне я ўжо нават не ўзгадваю: у адзенні, дэкоры інтэр’ераў, мэблі. Калі браць драўніну (нават не канкрэтызуючы пра ўжытак асобных відаў дрэва), то ў нас было ўсё зроблена з яе. Хаты, мэбля, посуд, кросны, іншыя прылады працы – фактычна ўся культурная частка чалавечага жыцця.*



У той жа час, падкрэслівае даследчыца, рацыянальны аспект непарушна спалучаецца з духоўным. Дзікарослыя расліны выкарыстоўваліся (і нават дагэтуль могуць выкарыстоўвацца) у сямейнай абраднасці: радзіннай, вясельнай, пахавальнай.

*– Калі, напрыклад, нараджаецца дзіця, маглі яму пераразаць пупавіну на дрэве: калі нарадзжаўся хлопчык – на дубу, каб ён быў здаровы і моцны, як дуб. Ёсць побытавае выкарыстанне дрэва, а ёсць абавязковае рытуальнае, якое звязана з папярэднім. Або з тою ж самаю вадой, якою першы раз дзіця абмываюць, калі яно народзіцца – калі гэта дзяўчынка, зліваюць ваду пасля мыцця дзіцяці пад вішню (сімвалічна жаночае дрэва), калі хлопчык, то пад мужчынскае дрэва: дуб, ясень або явар.*

Яна тут жа прыводзіць мне прыклад такога звышцеснага адзінства народных уяўленняў – трэба сказаць, крыху нечаканы:

*– Трыпутнік, які мы ведаем (па-руску «подорожник»), выкарыстоўваўся не толькі як лекавы сродак. У Цэнтральнай Беларусі ён быў яшчэ і раслінай, на якую варажылі! Знаходзілі трыпутнік на раздарожжы і на купальскіх варожбах, калі трэба было даведацца пра свой будучы лёс, свайго суджанага, казалі: «Трыпуце, трыпуце, ты стаіш пры пуце, ты бачыш старога і малога, ці бачыш ты майго мілога?». То бок, расліна выкарыстоўвалася не толькі у народнай медыцыне (тое ж самае спыненне крывацёку), але і ўвасабляла сабой вось такога медыятара, пасрэдніка паміж гэтым светам і тым, невядомым. Тым, які можа дапамагчы даведацца аб сваім будучым лёсе. Беларуская культура вельмі сінкрэтычная па характары. Няма дакладнага размежавання на адну і другую сферы.*

## Шэдэўры лістоты і квецені

Выкарыстанне раслiннага арнаменту – вельмі яскравая частка беларускай прыкладной мастацкай культуры, падкрэслівае Яна.

І не толькі ў дызайне знакамітых слуцкіх паясоў або рушнікоў, а і ў аздабленні самых розных прадметаў абіходу. «*Гэта быў вельмі папулярны дэкаратыўны прыём,*– працягвае даследчыца,– *адзінае адрозненне – у тым, што ў некаторых рэгіёнах назіраецца большае выкарыстанне расліннага кампаненту, у іншых – меншае*».

– *Самыя старажытныя элементы дэкору ў народнай творчасці – геаметрычныя: сімвалы зямлі, трохкутнікі, крыжы. Пазней з'яўляецца антрапаморфны арнамент, а таксама ў выглядзе раслін, жывёл. Раслінны арнамент асабліва часта прысутнічае ў упрыгожваннях: на мэблі, куфарах, ліштвах хатаў, не кажучы ўжо пра вопратку і рушнікі. Прычына навідавоку. Гэта тое, што нас атачае, што атачала нашых продкаў, было для іх важным. І, канечне, калі праз усё жыццё праходзіць бясконцы прыродны кампанент, нікуды ад гэтага не дзецца.*

Прадстаўнікі расліннага свету – не толькі мастацкі фон, але і нязменныя героі беларускіх песень, казак і паданняў.

– *Амаль увесь сямейны цыкл песень, асабліва вясельная лірыка, утрымлівае ў сабе процьму ўзгадванняў пра каліну, маліну, рабіну як вобразы нявесты, маладой, якая робіць крок, пераходны з незамужняга стану ў шлюбны. Вельмі часта сімволіка жаночая у беларускіх песнях прысутнічае ў вобразе «жаночых» дрэў: вішні, ці памятаеце: «шэпчуцца явар з калінаю»… Апошняя цытата – яскравы прыклад уяўлення пра мужчынскую і жаночую сімволіку: явар – дрэва «мужчынскае», а «жаночае» – каліна, вішанька… Гэта больш адносіцца да сямейна-абрадавага фальклору. Але, канечне, шмат і звычайных песень, у якіх даволі часта трапляюцца ў тэксце тыя ці іншыя расліны.*

У наш час мастацтва з расліннымі матывамі і матэрыяламі драўніны, лісця, кветак прысутнічае і ў выглядзе сувеніраў і ювелірных вырабаў. Частку іх ствараюць беларускія рамеснікі, упрыгожваючы сваімі творамі турыстычныя лакацыі і ствараючы тым самым непаўторную атмасферу для цікаўных турыстаў.

## Гісторыя з этнаграфіяй

Гаворачы пра навуковыя экспедыцыі ў той або іншы рэгіён нашай краіны, немагчыма абысці тэму параўнальных асаблівасцей этнабатанікі. Напрыклад, я не змагла самастойна ідэнтыфікаваць «заштырыну» – дрэва, кару якога выкарыстоўвалі ў лекавых мэтах на радзіме продкаў, паўзмежжу Палесся. Яна Сяргееўна тлумачыць: з народнымі найменнямі дзікарослых раслін не ўсё так проста:

– *Тое, пра што вы пытаеце, можа быць рэгіянальнай назвай аднаго з часта выкарыстоўваемых дрэў. І самае цікавае, што ў беларускай мове, увогуле ў беларускай культуры пры даследаванні раслін навукоўцы выдзелілі такую катэгорыю, як расліны-ўніверсалы – найбольш папулярныя, якія лечаць вялікі спектр хвароб. Па народных уяўленнях, адна такая расліна можа вылечыць шмат хвароб. Напрыклад, святаяннік (па-руску – «зверабой»). Альбо «крываўнік» (па руску – тысячелистник). Ці «падбел» – гэта «мать-и-мачеха» тая самая. Расліна адна, але ў кожным рэгіёне Беларусі лакальныя назвы могуць адрознівацца: напрыклад, і «купалка», і «доля», і той жа самы «святаяннік», «зелле святога Яна» – вялікі вельмі арэал.*

Яна прыводзіць іншы прыклад: «*Расліна, якая лечыць хваробу стрававання, на біялагічны манер называецца «лапчатка прамастойная». Лакальны варыянт назвы – калган. Але калі пералічыць, у гэтай зёлкі ёсць з дзясятак назваў, і ў кожнай мясцовасці можа быць свая. Калган, сурмоліна, узік, вязьтрава… І пры гэтым розныя варыянты назвы ў залежнасці ад таго, дзе яна выкарыстоўваецца*». Падобная сітуацыя выяўляецца нярэдка ў адносінах да самых розных траў, хмызнякоў і дрэў, дадае Яна, таму часам бывае даволі складана высветліць, пра якую траву вядзецца гаворка. «*Калі пачнеш у інфарманта выведваць, як яна выглядае, якія ў яе кветачкі, калі цвіце, то чуеш, напрыклад, што «гэта вось такая трава, а гэта вось такая». Здараецца часам, што нават у межах аднаго раёна адной вобласці адна і тая ж расліна называецца па-іншаму. Таму ў вашым выпадку можа быць такое, што гэта было нешта агульнавядомае. Але гэтая варыянтнасць назваў вельмі цікавая як з'ява і гаворыць пра тое, што ў кожным культурным асяроддзі, у кожнай мясцовасці або грамадзе была нейкая свая невялічкая традыцыя, звязаная з выкарыстаннем той ці іншай зёлкі, або травы*».

## Калі раніца пачыналася не з кавы

Зараз у свеце зрабілася модна пераходзіць на раслінную ежу і духоўныя практыкі, але мала хто ведае, што ў своеасаблівым выглядзе ўсё гэта існавала і ў нашых продкаў – не толькі

беларусаў, але і ўвогуле славян альбо балтаў. І гаворка не толькі пра хрысціянскія пасты (хоць і гэта, канечне, традыцыя). Замест цяперашніх гарбаты і кавы, якія прыйшлі да нас пазней з Усходу і Захаду, продкі запарвалі «скрыпень», або «кіпрэй» – мы ведаем яго як «иван-чай». У некаторых вёсках яго і цяпер выкарыстоўваюць як прафілактычны сродак. Але ці шмат сучаснікаў ведае, што ў продкаў раніца пачыналася з кіпрэю?

*– Культура назапашвання беларусамі раслін – гэта культура не проста «пайсці, нарваць і пакласці», а цэлая навука, сістэма прадпісанняў: як правільна заходзіць у лес, як там сябе паводзіць, як назбіраць расліны, дрэва так, каб назапасіць і не прынесці шкоды прыродзе, і пры гэтым самому прытрымліваца нейкіх маральных і этычных норм,* – распавядае Яна Сяргееўна. *– Веды ў гэтай галіне патрэбныя для таго, каб гарманічныя адносіны «прырода – чалавек» існавалі і сёння, а для гэтага трэба прыцягнуць людзей і да традыцый захавання нашай флоры, і да традыцый яе выкарыстання.*

Прывіванне людзям любові да раслін іграе ролю культурнага каталізатара, бо гэта крок адначасова і да захавання нацыянальнай культуры, і да павышэння экалагічнай самасвядомасці (што, безумоўна, у інтарэсах краіны і грамадства):

*– Традыцыі абыходжання з раслінным светам з'яўляліся важным складнікам беларускага ладу жыцця, пры якім чалавек быў часткай прыроды. Цяжка было паводзіць сябе па-за межамі таго, як прадпісвала грамада, а згодна з яе правіламі, трэба было з павагай ставіцца да прыроды. Гэтаму таксама можна навучыць і сённяшнюю моладзь.*

## Папараць-кветка і глабалізацыя

Традыцыя збору зёлак вельмі старажытная яшчэ і таму, што з раслінамі былі (і застаюцца) звязаны ўсе значныя святы. Пачынаючы з Купалля, карані якога хаваюцца ў далёкай дахрысціянскай даўніне. *«Гэта відавочна,* – разважае Яна, – *дзень святога Іаана – на хрысціянскі манер, але здаўна гэта было свята ўшанавання Сонца».*

*– Гэта час максімальнага росквіту прыроды, калі ноч найбольш кароткая ў годзе і самы доўгі дзень. Лічылася, што менавіта ў дзень летняга сонцастаяння зёлкі атрымоўваюць найвялікшую лекавую моц для таго, каб лячыць хваробы. Або выкарыстоўваца, напрыклад, для акурвання хаты ад рознага негатыўнага ўздзеяння: упуду, калі меў месца нядобры ўплыў на дзіця, пасля якога яно крычыць, не можа супакоіцца.*

З вядомых навуцы рытуальных духмянасцяў у беларусаў найпапулярнейшым быў палын, удакладняе Яна Сяргееўна. Пазней, з прыходам хрысціянства, з гэтай жа мэтай сталі выкарыстоўваць грамнічныя свечкі.

*– Але абкурванне палыном – з'ява нашмат больш старажытная за хрысціянства. З цягам часу адбылося напластаванне адных вераванняў на іншыя, і разам з уяўленнямі пра лекавую моц зёлак і іх актыўнае выкарыстанне стала існаваць і павер'е пра дзень святога Іаана Хрысціцеля, хоць насамрэч мы ведаем, што прырода гэтага свята дахрысціянская і звязана з культам Сонца, салярнай сімволікай. Свята і асабліва сакральная ноч лічыліся асаблівай кропкай часу і прасторы – паміж гэтым светам і іншасветам, калі лёгка магчыма іх ўзаемадзеянне з-за таго, што мяжа сціралася. Адсюль і гулянні, скокі цераз вогнішча, спробы змагацца з мясцовымі ведзьмамі, якія адваджвалі малако ў жывёл, збіранне крапівы, дзядоўніка – гэта ўсё Купалле.*

Што датычыцца пошуку самай легендарнай кветкі году, то тут усё няпроста. Пачнем з таго, што вынікі даследаванняў разбіваюць міф аб тым, што папараць-кветка выключна «наша». Хоць беларусы самі сталі падобныя да яе – няўлоўныя, загадкавыя, каштоўныя і неўміручыя ў стагоддзях.

*– Я думаю, што легенда пра кветку папараці – агульная ўсходнеславянская з'ява, а не чыста беларуская,* – дзеліцца высновамі суразмоўца. *– Яна характэрная і для ўкраінцаў, ёсць пэўныя праявы на частцы тэрыторыі Расіі.*



*Мне падаецца, гэта проста агульны вобраз, звязаны з культам раслін.*

Яшчэ цікавей, што ў купальскай традыцыі расліна надзелена зусім іншым сімвалізмам, чым даследчыкам вядома ў звычайным сэнсе – як адзін з «мужчынскіх» раслінных вобразаў: «*Гэта зусім іншая папараць-кветка, якую, як мы ведаем па легендзе, ніхто ніколі не бачыў, ніхто не можа знайсці, а хто знайшоў, тыя назад і не вярнуліся*».

Адценне пакланення, характарыстыкі неадназначнай чароўнасці – напэўна, тут любы чытач міжволі прыгадае сюжэтныя павароты твораў Мікалая Гогаля. Яна Сяргееўна тлумачыць, што гэта нездарма: такі сакральны аспект – «*проста квінтэсенцыя ўшаноўвання расліннага свету – часткі прыроды, якое знайшло ўвасабленне ў такіх вось легендах пра папараць-кветку*».

## «Флорысты» маркетынг – рухавік прагрэсу

Адзін з напрамкаў даследаванняў Яны Сяргееўны – тое, чым яшчэ не займаліся іншыя этнолагі: выкарыстанне народных ведаў пра расліны ў сучаснасці. Аб гэтым яна напісала ў сваёй кнізе. Гэта праца на памежжы этналогіі, гісторыі, этнаэкалогіі. «*Як расліны сёння могуць рэпрэзентаваць краіну ў якасці брэндаў і яе папулярызаваць?*» – вось тыя пытанні, якімі задалася навукоўца.

Як удалы прыклад прыводзіць маркетынгавы ход у час Еўрапейскіх гульняў 2019 г., да якіх спецыяльна выпусцілі марожанае з валошак. «*Яно блакітнага колеру ад таго, што дадавалі ў яго экстракт пялёсткаў валошкавых, быццам сочыва, і атрымоўвалася блакітнае марожанае, прычым яно раскупалася на «ўра» і стала візітнай карткай спаборніцтваў і краіны*, – адзначае мая суразмоўца. – *Чым не прыклад таго, як можна выкарыстоўваць расліну, тым больш усім вядомы васілёк? Ён настолькі папулярызаваўся і ўвайшоў у менталітэт беларусаў як расліна-маркер, як, можна сказаць, эмблема, звязаная з Беларуссю, што проста немагчыма ўявіць сабе іншае прымяненне*».

Сучаснае раслiннае брэндзіраванне кампаній асацыятыўна адсылае наведвальніка да беларускай культуры, напрыклад, творчасці Максіма Багдановіча, адзначае Яна: «*А вось паглядзіце, нават калі выйдзеце на вуліцу: сетка рэстаранаў нацыянальнай кухні – «Васількі». А што ў нас на эмблеме айчыннай авіякампаніі «Белавія»? Таксама васілёк, або, па-іншаму, валошка*».

Даследчыцу радуе, што ў крамах краіны, а часам і за яе межамі, становіцца ўсё больш беларускіх брэндаў, у прадукцыі якіх так ці інакш «задзейнічаны» тутэйшыя прадстаўнікі флоры. Сярод мноства вядомых гандлёвых марак «наўскідку» называе беларускія:

– «*Калі ласка» ёсць брэнд, «Белтеа», што выпускае гарбату беларускую, і з дадаткамі – чаборам, васільком, мятай. Вялікі такі працэнт айчынных марак. Раней неяк было не так, а цяпер цікавасць адраджаецца, людзям хочацца паспрабаваць сваё, уласнае. Канечне, гарбата гэта робіцца ў сучасным выглядзе; тое, што мы называем «гарбата», нашы дзяды, продкі проста называлі «чай». Яны валодалі ведамі пра тое, чым можна вылечыць тую ці іншую хваробу, і такім чынам яны рыхтавалі зборы на кожны выпадак жыцця. І ў гэтым мелі вялікі поспех, таму дагэтуль вельмі папулярна ўжываць расліны ў народнай кухні і медыцыне.*

Апафеозам гэтага працэсу навукоўца лічыць магчымасць «*вельмі ўдала прэзентаваць краіну, задзейнічаючы раслінныя брэнды*» на яе таварах, якія ўжо сталі пазнавальнымі. «*Сучасныя беларускія касметычныя брэнды больш за ўсіх выкарыстоўваюць раслінныя экстракты, гэта зараз папулярна. Нашы майстры актыўна вырабляюць упрыгожванні на аснове засушаных кветак, лістоў дрэваў. Гэта паўнавартасны і, можна сказаць, цэлы аспект дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Магчыма ажыццявіць ўсё, на што толькі здатна чалавечая фантазія*».

Беларусь як краіна кветак – вобраз амаль казачны, як з дзіцячай мары ці паданняў пра зямлю абетаваную. Напэўна, кожнаму хочацца бачыць сваю Радзіму менавіта такой… Бо іхняе хараство – «*гэта тое, што з дзяцінства вызывае захапленне ў чалавека*», з'яўляецца адной з прыемных частак яго жыцця, звязана з найлепшымі яго момантамі. Таму, лічыць Яна, зусім не дзіўна, што «*на кожную расліну знойдзецца свой піар-мэнэджэр*».

## Брама неўміручасці

Што чакае Яніну навуку, якая гучыць смачна, як рэцэпт стравы: гісторыю з прысмакам этнаграфіі, прыпраўленую этнабатанікай?

Магчыма, праз сто гадоў людзі будуць вандраваць па галактыках, беражна пера-

возячы з сабой парасткі зялёных сяброў, і наносіць «цвяток радзімы васілька» на борты найноўшых зоркалётаў… Мы, сучасныя дзеці асфальту, не ведаем усяго пра традыцыі мінуўшчыны, і яшчэ менш – пра нашу будучыню.

Але можна сказаць дакладна: Яна Шаўчэнка мае рацыю, кажучы:

– *Традыцыі, што складаліся тысячы гадоў,* – *гэта культурны «генетычны код», і нельга проста так узяць і вытравіць яго з памяці.*

Яна Сяргееўна ўпэўнена, што рознабаковае вывучэнне ўзаемакарыснага суіснавання чалавека з прадстаўнікамі флоры ніколі не спыніцца: «*Мы заўсёды будзем мець неабходнасць і патрэбу ў раслінах і раслінным свеце. Нягледзячы на тое, што ў нас – век прамысловасці, вялікіх тэмпаў урбанізацыі, калі вытворчасць ужо на хімічны, малекулярны ўзровень пераведзена, усё роўна прырода – тое, адкуль мы выйшлі. І людзі заўсёды будуць мець патрэбу ў ёй, бо гэта першаснае – тое, адкуль чалавек пайшоў. Таму проста немагчыма пераацаніць значэнне выкарыстання дзікарослых раслін у жыцці як сучасных беларусаў, так і нашых продкаў*».

Праца навукоўцы карысная і ў лакальным, і ў глабальным маштабе. Гаворка ідзе аб заахвочванні людзей да захавання духоўнай, культурнай, прыроднай спадчыны. І імідж месца, дзе ты жывеш, пагадзіцеся, нашмат прывабнейшы з валошкамі альбо рамонкамі, чым з рэчамі, якія не нясуць у свет хараство, здароўе і квітнеючае жыццё.

– *Можна паспрабаваць прадставіць нашу краіну, зрабіць такі цікавы яе «партрэт» на міжнароднай арэне: паказаць, што Беларусі насамрэч ёсць чым ганарыцца, што ёсць тысячы відаў раслін, якія могуць зацікавіць гэтай зямлёю і прыцягнуць да яе ўвагу замежных гасцей.*

У нечым наша сённяшняя гераіня падобная да некаторых сваіх «герояў», напрыклад моцных векавых дубоў (хоць, канечне, і пяшчотных бярозак з рабінкамі). Моцна ўросшы каранямі ў родную зямлю, дрэвы не могуць яе пакінуць. Чалавек тэарэтычна можа, але… Яна Шаўчэнка раптам прызнаецца напрыканцы нашай размовы: «*Не ўяўляю жыцця без сваёй краіны*». Уся яе праца пабудавана на вывучэнні традыцый людзей, што жылі і жывуць тут, у Беларусі. І гэтыя веды яна марыць перадаць тым, хто будзе жыць пасля нас – новаму пакаленню вучоных, якія калі-небудзь працягнуць справу папярэднікаў.

## Пра што не ведаў кот Шродынгера. Замест пасляслоўя

Я хачу скончыць свой аповед крыху на іншай ноце. Знакаміты навуковец, вядомы вопытам з катом (уласна, заснаваннем квантавай фізікі і заслужанай Нобелеўскай прэміяй) яшчэ ў 1944 г. зрабіў прадказанне. І датычыцца яно не кветак і раслін, не брэндаў і гісторыкаў, а ўсёй навукі XXI стагоддзя – гэта значыць, ужо цяперашняй.

Шродынгер прадбачыў пашырэнне спецыялізацый навукоўцаў, і не проста як спецыялістаў міждысцыплінарных даследаванняў, але і больш шырокага, мультыдысцыплінарнага профілю. Вучоныя, на яго думку, у нечым будуць падобныя да Леанарда да Вінчы або Эйнштэйна – даследчыкаў, звязаных з мастацтвам, і наадварот – мастакоў, улюбёных у навуку. Як мінімум, яны будуць займацца адразу некалькімі галінамі навук, спалучаючы іх у сваіх даследаваннях, вывучаць з'явы на стыку розных сфер ведаў.

Нешта падобнае мы ўжо назіраем сярод навукоўцаў, асабліва маладых, і ў тым ліку ў нашай краіне. Праца нашай гераіні таксама стаіць у шэрагу прыкладаў, што распачынаюць гэтую з'яву. Маладыя вучоныя – людзі новай фармацыі, выхаваныя на старых акадэмічных традыцыях, і менавіта таму за імі – будучыня.

Таццяна ЖДАНОВІЧ

